

Ірына Клімковіч

# Нябесная механіка ва ўяўленні старажытных беларусаў

## Страчаныя міфы пра Месяц і Сонца

Беларуская міфалогія, якая зрабіла вялікі ўплыў на развіццё беларускай культуры, узыходзіць ад часоў індаеўрапейскага адзінства і існавала за тысячы гадоў да нашай эры. Старажытныя продкі беларусаў, якія яшчэ не валодалі пісьменствам, пераказвалі гэтыя гісторыі наступным пакаленням на працягу шматлікіх стагоддзяў, каб захаваць іх для нашчадкаў.

Каманда HVILINA сумесна з журналісткай і публіцысткай, незалежнай даследчыцай традыцыйных вераванняў беларусаў і суаўтарам энцыклапедычнага слоўніка "Беларуская міфалогія" Ірынай Клімковіч апублікавалі падборку салярных і месяцовых міфаў Беларусі, якія атрымалася сабраць у розных кутках нашай краіны сучаснымі даследчыкамі і іх папярэднікамі.

У матэрыяле змяшчаецца не толькі вялікая колькасць касмалагічных сюжэтаў, якія апісваюць розныя з'явы, што назіралі нашы продкі, і іх інтэрпрэтацыю, але таксама звязаныя з імі святы, звычаі, традыцыі і сакральных жывёл. Матэрыял падзелены на чатыры вялікія часткі: міфы пра Сонца, Месяц, планету Венеру і іншыя нябесныя свяцілы.



# СОНЦА

## ЧАМУ СОНЦА СВЕЦІЦЬ ТОЛЬКІ ЎДЗЕНЬ?

Адразу пасля стварэння свету Бог даравалў Сонцу здольнасць свяціць заўсёды і ўсім істотам на зямлі — і добрым, і ліхім. Аднак Сонца стамілася асвятляць шлях ліху і паскардзілася Богу. У адказ на гэта Бог пакараў Сонца і абмежаваў яго святло толькі дзённым часам, а ўначы, калі блукаюць ліхія сілы, Сонца мусіла адпачываць. Такім чынам, Сонца стала дзённым свяцілам і сімвалізуе супрацьстаўленне дабра і ліха, святла і цемры, дня і ночы.

> У народзе кажуць: “Рай угары там, каля яснага сонейка, дзесь на паўдні, куды й птушкі ляцяць у вырай”.

Людзі верылі, што дзесьці на краі зямлі ўсё-такі застаўся накрыты Богам куток былога раю, дзе сонца свеціць вечна і ніколі не хаваецца за далягдядам. Сонца тут — крыніца дабра і ласкі, яно ніколі не злуецца і ласкава глядзіць на ўсіх, як маці на сваіх дзяцей. На думку даследчыка славянскай міфалогіі М. Галькоўскага, раней Сонца для славян было не проста крыніцай святла, а “дзённым вокам”, якое назірала за светам. Лічылі, што Сонца цягнуць па небе птушкі (гусі, качкі), а ўвечары яны апускаюць яго на ваду на самым краі свету, каб Сонца адпачывала ўначы ў сваім палацы. Паводле некаторых крыніц, дзесьці на поўдні, побач з Сонцам, ёсць Рай (Вырай) — цёплае і светлае месца, куды птушкі лятуць зімаваць.

## ЯКІМ НАШЫ ПРОДКІ ЎЯЎЛЯЛІ СОНЦА

По старажытных народных уяўленнях, Сонца - гэта вялікае касмічнае (Божае) вогнішча, яно “саграваe” неба, каб там было цёпла. У той жа час яно найвышэйшае ўвасабленне касмічнага агню. У больш позні інтэрпрэтацыі людзі ўяўлялі Сонца круглым, таму што Бог змясціў перад ім з боку Зямлі вялікую круглую лупу. Яшчэ Сонца параўноўвалі з велізарным колам, якое коціцца па небе, як у старой загадцы пра катушку: “Кацілася катушка, ні звер, ні птушка...”

Каравай, які пяклі ў доме нявесты, рабілі круглым, як Сонца, а ў хаце жаніха — у форме Месяца.

Цікава, што графічная семантыка карагода — кругавога абрадавага танца ўсходніх славян — нагадвае кола, і праз гэта звязана з Сонцам. Таксама карагод адпавядае індаеўрапейскім выявам Сонца ў руху, якія сустракаюцца на посудзе бронзавага веку з беларускіх зямель.

## ЯК БОГ ПУСЦІЎ СОНЦА Ў ДОМ (МІФ)

Калі свет толькі пачынаў сваё існаванне, людзі не ведалі, як пабудаваць дом, каб у ім было светла.

Так, адна сям'я беспаспяхова спрабавала занесці ў дом святло: то рэшатам, то ў мяху. Але аднойчы праходзіў побач мудры чалавек, які насамрэч быў самім Богам. “Што вы робіце?”- спытаў ён. Людзі паскардзіліся: “Мы пабудавалі дом, але ў ім так цёмна, бо сонца не можа трапіць унутр”. Тады Бог прапанаваў дапамогу ў абмен на абяцанне кожны тыдзень пускаць у дом беднага чалавека, карміць яго і даваць прытулак на ноч. Людзі пагадзіліся, і Бог зрабіў у доме вокны, праз якія ў яго ўвайшлі святло і цяпло. З тых часоў беларусы будавалі дамы так, каб вокны выходзілі на сонечны бок, дзе ўзыходзіць сонца. Гэта ёсць сімвал гасціннасці і святла, якія аднойчы знайшлі шлях у дом чалавека.

## СОНЦА І МЕСЯЦ ЯК ВОЧЫ БОСТВА

У рамках “астранамічнага кода” нашы продкі ўспрымалі Сонца і Месяц як вочы Боства. Дзень суадносіўся з Сонцам, а ноч — з Месяцам. Сонца — гэта дзённае нябеснае вока, якое прыглядае за парад-



кам у свеце.

**❝ Старадаўняя загадка кажа: “Што гэта за вочы: адно свеціць удзень, а іншае – уночы”. Адказ: Сонца і Месяц.**

## УЗЫХОД СОНЦА: СІМВАЛЫ І АБРАДЫ

Узыход Сонца, або світанак, — час, калі сонца з'яўляецца над гарызонтам, — успрымаўся славянамі пазітыўна, надзяляўся станоўчай сімволікай і супрацьпастаўляўся заходу.

Продкі параўноўвалі ўзыход з пачаткам новага дня, з ідэяй нараджэння дзённага святла, маладосці і жыцця. Таксама ў народнай традыцыі ўзыход асацыяваўся з месцам рассялення сакральных персанажаў: "Адкуль Сонца ўзыходзіць — адтуль Божая Маці на мой двор прыходзіць", "Ад усходу Сонца да заходу ішла Святая Пяцінка Параскева".

Каб абараніцца ад злыдухаў і хвароб, маці з дзецьмі кладліся спаць галавой на ўсход Сонца. У малітвах на ўзыходзе гэтага свяціла людзі звярталіся з просьбамі аб дапамозе і ацаленні. Па славянскай традыцыі памерлых хавалі нагамі на ўсход Сонца, у бок раю, што падкрэслівае сувязь паміж усходам Сонца і вечным жыццём.

На Дабравешчанне і Чысты чацвер падчас усходу Сонца ладзілі рытуалы па знішчэнні шкодных насякомых, прымушалі дзяцей бегаць голымі вакол хаты, падмяталі падлогу. З усходам Сонца славяне пачыналі ткаць, каб "як Сонца грае, так і ткалася іграючы".

На Івана Купала на ўзыходзе Сонца збіралі лекавыя зёлкі. А таксама ў трох месцах касілі траву, прамаўляючы малітвы на багаты ураджай: "Дай, Божа, спор су ўсіх трох поль".

Падчас засухі, каб выклікаць дождж, цнатлівыя дзяўчаты ці ўдовы павінны былі выліць святую ваду ў тры студні на ўзыходзе Сонца. У той жа час перыяд да ўзыходу Сонца асацыяваўся з тагасветам. Гэта ўвасабляецца ў паданнях пра русалак, якія танчаць ноччу ў жытніх палях, і ведзьмаках, якія забівалі ў такія палі асінавыя калкі, каб каласы былі пустымі.

## ЗАХОД СОНЦА: ЗАБАРОНЫ І РЫТУАЛЫ

Заход Сонца — невялікі адрэзак часу, калі Сонца набліжаецца да гарызонту, але яго яшчэ бачна на небе. На гэты перыяд у славян існавала мноства табу. Напрыклад, на заходзе забаранялася класці дзяцей спаць, каб Сонца не забрала іх з сабой. Таксама не распачыналі важныя справы.

**❝ У гэты час актывізавалася знішчальная магія праклёнаў: "Закацісь ты гарачым сонцам пад кустом!"; "Хуць цябе сонцам закаці!"; "Штоб ты на захад сонца ішоў!".**

Лячыць хворае дзіця насілі на світанку, а ваду, якой абмывалі спалоханага чалавека, вылівалі на заход Сонца. Пасля купання немаўлятаў ваду вылівалі туды, дзе не свеціць Сонца, не ходзіць ані чалавек, ані скаціна — у месцы, якія мяжуюць з тагасветам. Тое ж самае было і пры абмыванні нябожчыка.

З надыходам заходу Сонца актывізаваліся прывіды і духі продкаў. Да заходу Сонца распальвалі вогнішчы на Купалле, пачыналі вячэру на Дзяды — такім чынам людзі злучаліся з духамі продкаў, якія з'яўляліся на зямлі толькі з надыходам цемры. Пасля заходу Сонца дзейнічала мноства забаронаў: не выносілі смецце з хаты, нічога не пазычалі, завяршалі ткацкія працы, каб не прывабіць ваўкоў у вёску; і нават не смяяліся, кажучы пры гэтым:



"Сонца нема, што ты зубу шчарыш?!". Так падыходзіў да канца жыццярадасны адрэзак часу, наступала цемра, а з ёй актывізаваўся і іншасвет. Асабліва небяспечным лічыўся прамежак пасля заходу Сонца да спеваў першых пеўняў. Але менавіта пасля заходу Сонца ў паселішчах Беларусі ў часы эпідэміі халеры ладзілі магічны абрад стварэння так званага абыдзённіка - ручніка-абярэга і ўстаноўкі абыдзённага Крыжа. Абрад праходзіў так: жанчыны ўсёй вёскі ад заходу Сонца да Світанку ткалі ручнік; мужчыны ў гэты час ішлі ў лес, выбіралі дрэва, звычайна сасну, і рабілі з яе крыж. Крыж укопвалі, і, пакуль не паднялося Сонца, вешалі на яго ручнік. Потым запрашалі святара асвяціць абярэг. Калі па нейкіх прычынах не ўдавалася завяршыць рытуал да ўзыходу Сонца, лічылі, што ніякай магічнай сілы абярэг мець не будзе. Гэты абярэг уважалі за магутнага абаронцу ад хвароб і ўсялякіх пошасцяў.

## НЯБЕСНАЯ СЯМ'Я (МІФ)

Паводле старажытнага міфу, вядомага як "Нябесная сям'я" або "Нябеснае вяселле", Сонца і Месяц паўстаюць ідэальнай шлюбнай парай. Сонца ўвасабляе жаночы пачатак, ідэальную гаспадыню, а Месяц — мужчынскі, то бок, ідэальнага гаспадара. Зоркі — іх дзеці, а Космас — гэта церам і двор, сімвал бездакорна ўпарадкаванага Сусвету. Але гэты ідэальны парадак часам парушаецца. Месяц з-за сваёй зменлівай прыроды часам заляцаецца да Вечарніцы (Венеры), за што Пярун яго сувора карае. Астранамічна гэта адпавядае перыядычным збліжэнням Венеры і Месяца на небасхіле.

## ЗНАК СОНЦА Ў АРНАМЕНЦЕ

У народных арнаментах сонца — галоўнае боства многіх народаў старажытнасці, у тым ліку і продкаў беларусаў. З даўніх часоў, пачынаючы з неаліту, на тэрыторыі Беларусі існавала салярная сімволіка. Старажытныя майстры ўпрыгожвалі свае вырабы з гліны, дрэва і косці колцамі з кропкай у цэнтры, якія сімвалізуюць Сонца. Гэты матыў быў асабліва папулярны на касцяных грабянях, калчанах для стрэл і дзяржальнях нажоў. У разьбярстве па дрэве матыў Сонца набываў выгляд шматпрамянёвага круга. Такі ўзор можна было ўбачыць на калаўротах, чаўнах і іншых побытавых прадметах. На пінскім Палессі дагэтуль захавалася традыцыя ўпрыгожваць франтоны дамоў інкрустацыямі ў выглядзе сонечных дыскаў, што ёсць водгаласам старажытных абярэгавых традыцый. Яшчэ ў пачатку XX стагоддзя такія ўзоры выконвалі ахоўную функцыю. У тэкстыльным арнаменце со-нечны матыў таксама быў вельмі папулярны. Першапачаткова адлюстроўваўся ў выглядзе круга з кропкай у цэнтры на касцяных або драўляных вырабах, у тэкстылі ён трансфармаваўся ў ромб з прамянямі або гачыкамі. Гэтым узорам упрыгожвалі ручнікі, паясы, навалачкі і абрусы.

## ЗНАК СОНЦА НА КРЫЖАХ

Паводле мастацтвазнаўцы М. Раманюка, самая распаўсюджаная форма хрысціянскіх крыжоў у Беларусі — чатырохканцовая. Аднак, як адзначае філосаф і тэолаг І. Дубянецкая, крыжы не заўсёды звязаны з канкрэтнай канфесіяй, а часцей служаць адлюстраваннем мясцовых традыцый. Такія крыжы, умоўна званыя "сонцакрыжамі", ўвасабляюць Сонца-Хрыста, новы світанак і новую Праўду, што асвятляе свет. У іх няма строга вызначанай формы, але ёсць канцэпцыя: апроч чатырох асноўных прамянёў, яны ўключаюць у сябе цэнтральны квадрат або круг, а таксама дадатковыя прамяні, якія часам маюць абрысы змеяў. Некаторыя даследчыкі лічаць Крыж сімвалам Сонца і нябеснага Агню. У народнай культуры чырвоны колер Сонца тлумачыцца тым, што яно напіваецца крыві, пралітай там, дзе ідзе вайна.



## КУПАЛЛЕ І ГУЛЬНЯ СОНЦА

Купалле — дзень летняга сонцастаяння, калі Сонца дасягае сваёй найвышэйшай сілы, дзякуючы чаму зямля ажывае і расквітае. У гэты час Сонца падымаецца над зямлёй і выпраменьвае самыя гарачыя і інтэнсіўныя прамяні, грэючы зямлю і азараючы яе святлом. Гэта ёсць момант кульмінацыі ў адносінах Сонца і Зямлі. З сонцастаяннем звязаны старажытны астральны міф.

> Кажуць: "На Івана Купалу сонейко грае. Раненько, як толькі яно ўзыдзе, так і пачне кружыцца да скакаць. Нашы пастухі раненько гоняць гаўядо на пашу... та яны заўжды бачаць, як сонейко грае”.

Назіранне за гульнёй Сонца ў нашых продкаў было часткай купальскага абраду. Убачыць гульню Сонца пасля "бясконцай" купальскай ночы лічылася добрым знакам для ўсіх удзельнікаў абраду і для прыроды. Апроч таго, гульню Сонца можна назіраць і ў іншыя святыя дні — на Дабравешчанне і Вялікдзень. Гульню Сонца пазначалі такімі словамі, як "сонца купаецца, радуецца, мяняецца, скача, дрыжыць". Тэрмін "гульня Сонца" ўвасабляе любоўную гульню, падлашчванне, акт стварэння новага жыцця. У фальклоры часта згадваецца, што Сонца гуляе са Світанкам. Гэты матыў — гульня Сонца — добра развіты ў індаеўрапейскай спадчыне, дзе ранішняя Дзянніца малюецца як багіня Ушас — прыгожая, апранутая ў яркі ўбор дзяўчына, якая з'яўляецца на досвітку на залацістай калясніцы і дае людзям росквіт і нашчадкаў. У адной беларускай народнай песні Зараніца губляе ключы, якімі павінна кожную раніцу адмыкаць неба, каб выпусціць дзень; знаходзіць гэтыя ключы Сонца. Жаданне бачыць "гульню Сонца" адлюстравана ў народных песнях, дзе людзі просяць Сонца пагуляць з Дзянніцай. Напрыклад, у купальскай песні спяваецца: "А хадзем, сястрыца, / / пад ясну зарыцу, / / Іграй сонца із за зарою!// або "Сягодня Купала, заўтра Ян, / / Зайграй, соненька, зайграй нам".

> Просьбы людзей сімвалізуюць надзею на ўраджай і дабрабыт: "А на Купалу рана / / Сонца йграла / / На добрыя гады, На цёплыя росы, на хлябы-ўраджаі".

Працягам гульні Сонца ёсць яго купанне ў вадзе: "У нядзельку раненька сіне мора калыхалася, / / Сонейка ды купалася". На Купалу запальваюць драўлянае кола, якое сімвалізуе Сонца, і коцяць яго з пагорка ў ваду. Такім чынам, купальскія абрадавыя дзеянні шмат у чым паўтараюць дзеянні нябеснага боства. У беларускім сонніку ўзыход Сонца сімвалізуе каханне і дабрабыт. Бачыць Сонца ў ва сне — муж будзе кахаць і жыта ўродзіцца.

"Зайчык" — гэта светлавая пляма - адбітак Сонца. На Купалле Сонца гуляе зайчыкамі, рассыпаецца на мноства частак, а затым раптам збіраецца ў адзін круг, што сімвалізуе адзінства і гармонію прыроды.

## МАРОЗ, КАЛЯДЫ І СОНЦА

Мароз — гэта міфічная істота, якая ўвасабляе зімовую сцюжу. Паводле легенд, Мароз заўсёды любіў змагацца з Сонцам, але ніколі не мог яго адолець; у сваёй роспачы ён клікаў на дапамогу вецер. І толькі на Грамніцы — свята першай сустрэчы зімы з вясной, якое адзначаецца 2 лютага ў каталікоў і 15 лютага ў праваслаўных, — Сонца магло адразу ж растапіць бараду Марозу і скончыць яго панаванне.

Успомнім такое важнае для беларусаў свята, як Каляды (зімовае сонцастаянне). Рэч у тым, што для земляроба сярэдняга геаграфічнага пояса час з кастрычніка па снежань — гэта перыяд, калі прырода нібы замірае і перастае дыхаць. Раней у свя-



домасці чалавека зіма асацыявалася з валадарствам цёмных сіл, якія знішчалі ўсё жывое. Дні станавіліся карацей, а ночы — даўжэй, і здавалася, што цемра перамагае святло. Каб супрацьстаяць гэтаму, беларусы выкарыстоўвалі Калядную Зорку — сімвал Сонца (або, па некаторых меркаваннях, Венеры), якую насілі ад хаты да хаты цягам двух тыдняў з 24 снежня па 7 студзеня. Беларусы верылі, што іх Зорка і звязаныя з ёй рытуалы дапамогуць адрадзіць сапраўднае Сонца і перамагчы цемру. І сапраўды, дзень павялічваўся, а ноч змяншалася — пачынаўся новы сонечны цыкл і аграрны год. А разам з гэтым прыход цяпла і святла, адраджэнне жыццядайных сіл Зямлі. Так нашы продкі разумелі прылады ўздзеяння на Космас абумоўленыя яго законамі. Яны верылі, што, калі іх не выконваць, парушыцца касмічная цыклічнасць і наступіць поўны Хаос. Менавіта таму Каляды для беларусаў мелі асаблівае значэнне.

## ГРАМНІЦЫ І НАРАДЖЭННЕ МАЛАДОГА СОНЦА

Грамніцы — унікальнае славянскае свята, яго адзначаюць 2 лютага. Гэты дзень - сімвалічны пачатак вясны, ён абумоўлівае пераход ад зімовага сезону да вясновага і нараджэнне маладога Сонца. Па словах даследчыка беларускай міфалогіі XIX стагоддзя Адама Кіркора, Каляды адлюстроўваюць нараджэнне новага боства — Дажбога, Бога Маладога Сонца, які ёсць сімвалам святла, сынам магутнага Перуна і яго жонкі Грамніцы.

Сутнасць Калядаў даследчык тлумачыў як адлюстраванне змагання падземнага цара Карачуна (або ўладара марозаў Зюзі) з самім Перуном. Перад зімовым сонцастаяннем падземны цар прадказвае, што павінен нарадзіцца Бог, і таму імкнецца загубіць дзіця. Бо сваім нараджэннем Бог Маладога Сонца сімвалізуе смерць падземнага боства цемры і холаду. Каб гэтага не адбылося, Карачун ператвараецца ў мядзведзя, збірае зграю ваўкоў (увасабленне Мяцеліцы) і разам з імі ганяецца за жонкай Перуна — Грамніцай (увасабленне Венеры на небе). Але багіня, якая спусцілася з нябёсаў, хаваецца ў зарасніках вербалозу і нараджае боства — Дажбога — Бога Маладога Сонца. Як і кожны нованароджаны, Дажбог уразлівы ў першыя дні свайго жыцця. У гэты перыяд сілы цемры і холаду ўсё яшчэ пануюць на зямлі: дзень таксама кароткі, а ноч — доўгая. Але калі надыходзіць 2 лютага, Дажбогу спаўняецца сорак дзён, і ён пакрысе ўбіраецца ў сілу. Вера яго маці ў нарастаючую моц маладога бога, багіні Вясны і Лета (Грамніцы), настолькі моцная, што яна наважваецца паказаць сына богу Зімы і маразоў — Зюзі, даючы зразумець, што наспеў час саступіць месца новаму боству. І каб падкрэсліць гэты момант, яна суправаджае яго гучнымі грымотамі і бліскавіцамі маланак. Так у міфалагічным уяўленні беларусаў і адзначаецца свята Грамніцаў.

## СУСВЕТНАЕ ДРЭВА

У старажытнабеларускай міфалогіі існуе вобраз Сусветнага Дрэва — гіганцкага касмічнага дрэва, якое, на думку некаторых даследчыкаў, магло служыць цэнтрам Сусвету і сімвалам светабудовы ў цэлым. Паводле меркавання даследчыкаў, гэта дрэва знаходзіцца ў цэнтры Сусвету і яго шатамі ёсць неба. На вяршыні дрэва ся-дзіць птушка — Сонца, а на галінах гараць свечкі (зоркі). У галінах Сусветнага Дрэва месціцца Птушыны Вырай, а ў каранях — Змяіны. Дрэва расце на велізарным валуне, які стаіць пасярод бязмежных вод (акіяна). З вяршыняй Дрэва звязаны істоты "верхняга" свету — птушкі, з сярэдзінай — пчолы, людзі, жывёлы, а з каранямі — істоты "ніжняга" сектара — змеі, жабы і іншыя. Адзін з вобразаў Сусветнага Дрэва — Дуб.

**❝ У народнай загадцы гаворыцца: "Стаіць дуб-старадуб, //На тым**



дубе-стара-дубе //Сядзіць пцічка-каранічка.//Ніхто яе не спаймае: //Ні цар, ні царыца, //Ні красна дзявіца". Адказ — "Сонца".

Тут прасочваецца наступная карціна свету: воссю космасу з'яўляецца дрэва, на вяршыні якога сядзіць птушка — Сонца.

## ЯРЫЛА ЯК БОГ СОНЦА

У паганскай – язычніцкай - міфалогіі ўсходніх славян існуе вобраз Ярылы — бога Сонца, вясны і ўрадлівасці. У яго гонар ладзілі вясновыя гулянні, якія суправаджаліся песнямі, танцамі і карагодамі (у Беларусі вядома такое свята, як "Ярылавіца"). У хрысціянскія часы шанаванне Ярылы было замененана шанаванне святога Юр'я. У беларускай міфалогіі ён уяўляў сабой цудоўнага маладзёна ў белай кашулі верхам на белым кані. У адной руцэ ён трымаў маладыя парасткі жыта, а ў другой — чалавечы чэрап. Гэта сімвал таго, што ўсё калі-небудзь адродзіцца. Ярыла — бог урадлівасці і пажадлівых любошчаў. У Юр'еў дзень Ярыла па загадзе маці адчыняе браму неба і на белым кані спускаецца на зямлю. З яголым з'яўленнем распачынаецца сапраўдная вясна. У гэты дзень таксама ўпершыню выпускалі худобу ў поле. Святкаванне раней суправаджалася песнямі і баляваннем. Легенда адлюстроўвала Ярылу заступнікам пажадлівых любошчаў, таму пад ягонай абаронай не ўважалася ганебным зграшыць ў каханні. Конь у беларускай міфалогіі быў сімвалам Сонца, а два кані — сімваламі ўзыходу і заходу, якія забяспечвалі сонечную абарону з раніцы да вечара. Дахі некаторых дамоў упрыгожваліся фігуркамі коней. А ў традыцыях шматлікіх народаў маладыя людзі звярталіся да сонечных коней з просьбамі аб багацці і ўраджаі. Многіх сонечных бостваў уяўлялі вершнікамі на белым кані, што сімвалізавала дабрабыт і сілу. Існаваў і такі абярэг як падвеска-грэбень з конскімі галовамі. Матыў дубальтовых конскіх галоў мусіў быў узмацняць ахоўную функцыю абярэга.

## ЗАРА-ЗАРАНІЦА

Персаніфікацыя зары, якая захоўвае рысы яшчэ старажытнай індаеўрапейскай багіні, часта выяўляецца ў беларускіх магічных тэкстах-замовах. У беларусаў лячэнне з дапамогай замоў таксама строга звязанае з пэўнай парою сутак — на ранішнім світанку або вечаровым сутонні. У замовах да світанку звяртаюцца як да ведыйскай Ушас: "Зара-Заранiца, ясна царыца, Зара-Заранiца, божа памачніца (трэба разумець памочніца Сонца), Зара-Заранiца, красная дзявіца, Зара-Заранiца, кроўная сястрыца".

Загадка: "Што гарыць без агню?" — Адказ: Зара гарыць без агню.

Такім чынам, Зара-Заранiца, падобна Ушас, з'яўляецца на мяжы цемры і святла чароўнай гульнёй фарбаў на небасхіле, што азначае наступ новага дня разам з бачнасцю, бяспекай і магчымасцю працаваць. Гэты пераходны момант — час рытуалаў і малітваў. У беларускай традыцыі заведзена ўставаць на досвітку — перад усходам сонца, на світанку. Першае, што бачыў чалавек, які жыве ў вёсцы, калі прачынаўся, — гэта зараджэнне ранішняй зары. Ён вітаў яе і гадаў, які будзе дзень, калі толькі не было хмар.

**❝ Сувязь зары з Сонцам згадваецца і ў купальскай песні, цікавай сваім рэфрэнам: "А пойдзем, сястрыца, //пад ясну зарыцу, //Іграй сонца із за зарою! // А возьмем сястрыца // Па жмені пшаніцы... //Іграй сонца із з зарою!"**



# МЕСЯЦ

## ЧАМУ МЕСЯЦ СВЕЦІЦЬ ТОЛЬКІ ЎНАЧЫ?

Месяц — гэта начное нябеснае свяціла, астранамічны код традыцыйнай беларускай мадэлі свету. Яго акружае мноства вераванняў і прыкметаў. Ушанаванне Месяца сыходзіць каранямі ў часы індаеўрапейскага адзінства, магчыма, нават папярэднічала сонечным культам. Асаблівасць руху Месяца па зорным небе спарадзіла саму ідэю календара — Месяц стаў адрэзкам каляндарнага часу. Месяц як начное свяціла супрацьстаіць Сонцу як дзённаму свяцілу.

Адна з легенд кажа, што Бог загадаў Месяцу свяціць людзям уначы, пакуль Сонца адпачывае. Але Месяц ленаваўся і свяціў абы як, таму Бог загадаў яму адраджацца кожныя чатыры тыдні. Так, ён адзін тыдзень малады, іншы расце, трэці — поўны, а на чацвёрты зусім знікае. Месяц увесь час ідзе за Сонцам, але ніяк не можа яго дагнаць. У латышскім фальклоры Месяц жартаўліва называюць гультаём за тое, што ён не жадае свяціць удзень.

У беларусаў ёсць яшчэ адна легенда пра гэтае свяціла. “Бог, калі Месяц састарэе, крышыць яго на зоры. Адзін кавалачак кладзе ў дзяжу, на закваску. Зоры ападаюць туды, з іх пачынае рабіцца рошчына, цеста падыходзіць і пералівaецца цераз край. Гэтак і нараджаецца Месяц”.

## ПАКАРАННЕ МЕСЯЦА ЗА ЗДРАДУ

Матыў “пакарання Месяца” прасочваецца праз пазбаўленне яго першапачатковай цэласнасці. У балтыйскіх і беларускіх міфах гэта гісторыя “Нябеснага вяселля”, дзе ад пачатку Сонца і Месяц — ідэальная пара. У калядных і велікодных песнях прысутнічае тэма разбурэння ідэальнага сямейнага парадку ў выніку гневу Перуна. Вінаваты ў гэтым Месяц, які здрадзіў Сонцу, заляцаючыся да Вечарніцы (Венеры) — самай яркай зоркі ранішняга і вячэрняга неба. Яна ззяе так ярка, што канкуруе ў “прыгажосці” з Сонцам, якое альбо садзіцца, альбо яшчэ не ўзышло. Астранамічна гэта адпавядае перыядычным збліжэнням Венеры і Месяца на небасхіле.

У фальклоры Месяц нярэдка паўстае няверным мужам.

> ❝ Тэма шлюбнай здрады ўскосна падымаецца ў наступнай песні: “Ні разам усходзя месяц із зарою, // Ні на праўдзя жыве мой мілай са мною. // Ні на праўдзя жые – праўды не гавора // Змяркае – выходзя, світая – прыходзя”.

Такія паводзіны Месяца закранае інтарэсы Бога Навальніц (або самога Бога). Месяц абвінавачваецца ў трох грахах: парушэнні ўстаноўленага нябеснага парадку (здрадзе Сонцу), парушэнні забароны на інцэстуальныя стасункі (паколькі па адной з версій Месяц і Венера, як і іншыя зоркі, — гэта брат і сястра), і ў тым, што, магчыма, сам Бог Навальніцы (прадстаўлены на небе планетай Юпітэр) таксама меў пэўныя сімпатыі да Зарніцы (Венеры). За кожную з гэтых правінаў Месяц можа быць пакараны. Пакаранне непазбежна і ў беларускім, і ў балтыйскім фальклоры. Месяц альбо разбіваецца (Бог крышыць яго на зоркі), альбо рассякаецца — гэта адпавядае некальким дням, на працягу якіх Месяц не бачны на небе, альбо яго рэгулярна згадваюць у загадках як “акрайчык хлеба”. Але для самога Месяца такое пакаранне становіцца пачаткам яго бесперапынных цыклаў нараджэння і смерці — змены фаз. Сюжэт гэтага міфалагічнага матыву захаваўся на Тураўшчыне ў абрадзе, які называўся “біць месяца”. Ён заключаўся ў тым, што ўдзельнікі вяселля стукаліся спецыяльна выпечаным у форме Месяца печывам адно з адным і назіралі, чые зломіцца. Цікава, што апроч Месяца паралельна існуе яго форма як Луна. Пры гэтым Месяц ўвасабляе мужчынскі пачатак, а Луна — жаночы.

## АСАЦЫЯЦЫЯ МЕСЯЦА З ЗАМАГІЛЬНЫМ СВЕТАМ

Тэма пакарання, звязаная з Месяцам, перадаецца і ў хрысціянскім прадстаўленні аб братазабойстве. Каін і Авель былі першымі дзецьмі Адама і Евы, народжанымі пасля іх выгнання з Райскага саду. З рэўнасці і зайздрасці Каін забіў свайго брата і стаў першым забойцам у гісторыі чалавецтва. Бог змясціў іх выявы на месяцовым дыску як вечны напамін пра гэтае злачынства. І цяпер, калі прыгледзецца да Месяца падчас поўні, то можна ўбачыць, як брат стаіць з дзідай над забітым братам у выглядзе цёмных плям. "Крывавы" колер Месяца ў час поўні тлумачыцца тым, што Месяц, які ззяў падчас забойства, увабраў кроў першапакутніка.

Адсюль і моцныя асацыяцыі Месяца са светам памерлых — часцей за ўсё бязвінна забітых ці тых, хто заўчасна пайшоў з жыцця. Напрыклад, з русалкамі. Так, у беларускім фальклоры пры святле Месяца ажываюць русалкі. Яны гойдаюцца на дрэвах, плёскаюцца на паверхні вады ці бегаюць па палях, завабліваюць мінакоў.

Малітвы, якія чыталі на маладзік (фазы маладога Месяца ў выглядзе вузкага сярпа павернутага ражкамі налева), прысвячаліся душам, якія "не дачакаліся новага месяца", то бок нядаўна памерлым.

**❝ Замова, якая сведчыць пра сувязь Месяца з тагасветам: "Маладзік ты малады, ці быў ты на тым свеце? – Быў. – А ці баляць у мёртвых зубы?. – Не, не баляць".**

## ПАВЕР'І, ЗВЯЗАНЫЯ З МЕСЯЦАМ

Узімку Месяц рухаецца высока па небе, а сонца — нізка. Улетку ўсё наадварот. Месяцовае святло старажытныя славяне лічылі небяспечным і шкодным. Людзі баяліся, калі святло Месяца падала на калыску з немаўлём. А калі дзіця захварэла, казалі, што гэта "месяц засвяціў". Каб "адсвяціць" хворага, бралі валок для прання бялізны, спавівалі яго ў дзіцячую пялюшку і на ўсю ноч выкідалі на двор, каб на яго свяціў Месяц, — тады дзіця паправіцца. Уплывам месяцовага святла тлумачылася і такая хвароба як лунатызм — хаджэнне ў сне. Святло Месяца было неспрыяльным для агуркоў, гарбузоў, гароху, бобу, маку і выклікала ў раслін пустацвет. У зааморфным кодзе святло Месяца асацыюецца з зайцам. Месяцовыя зацьменні тлумачылі тым, што падчас войнаў Месяц напіваецца чалавечай крыві.

## ФАЗЫ МЕСЯЦА

28 дзён — поўны цыкл "росту" і "старэння" Месяца. Яго падзяляюць на чатыры фазы, або чвэрці: маладзік, першую чвэрць, поўню і апошнюю чвэрць. Зменлівасць Месяца, адрозненне яго чвэрцяў у беларускім фальклоры тлумачылі тым, што, калі Месяц старэе, Бог крышыць яго на зоркі.

У старадаўняй літоўскай песні "Вяселле Месяца" пераказваецца балта-беларускі вандроўны сюжэт "нябеснага вяселля". Маўляў, Пяркун (бог-грамабой) разгневаўся на Месяц за тое, што той здрадзіў Сонцу з ранішняй зоркай. За гэта Пяркун рэжа яго мячом. У адной з латышскіх песень Сонца самастойна карае Месяц за здраду. Цікава, што некаторыя даследчыкі звярнулі ўвагу на сувязь менструальнага цыклу жанчын з працягласцю чатырох фаз Месяца. І таму ў міфалагічнай свядомасці існавала ідэя, што перыядычныя штомесячныя нядужанні ў жанчын выклікае бог Месяца. Некаторыя народы вераць, што зачацце дзіцяці адбываецца падчас поўні, а таксама што дзяўчына можа зацяжарыць, калі паглядзіць на Месяц.

## ПАВЕР'І, ЗВЯЗАНЫЯ З ФАЗАМІ МЕСЯЦА

На маладзік распачыналі сяўбо, збіралі ўраджай і ставілі вуллі. На трэці дзень маладзіка абразалі дрэвы. У некаторых месцах лічылі, што саджаць што-небудзь у гэты перыяд нельга — лепш чакаць поўні. Затое верылі, што нават маленькая ранка, якая звычайна хутка гоіцца, на маладзік утварае нарывы, якія гояцца толькі да наступнага маладзіка. У гэты перыяд звычайна стрыглі валасы, але на маладзік не можна было чысціць коміны, бо пасля гэтага яны неўзабаве зарасталі сажай. Менавіта ў нядзельныя дні маладзіка шанавалі так званыя прошчы — сельскія святыні, святыя ўрочышчы і крыніцы. Таксама ў гэты час праводзілі ў храмах набажэнствы, прысвечаныя Багародзіцы. Апошняе можа казаць пра тое, што шанаванне Месяца было звязана з нейкім старажытным жаночым боствам.

Перад поўняй заведзена было калоць свіней, лячыць жывёлу, каб яна хутчэй расла, саджаць гародніну, секчы лес для будаўніцтва і закладваць падмуркі дамоў. Пры першым поглядзе на Месяц пасля поўні людзі жагналіся, але не голай рукой — інакш яна пачне хварэць, таму даводзілася ўсю руку хаваць у рукаў.

Перыяд на Поўню лічылі спрыяльным часам для завяршэння спраў і стварэння запасаў. У перыяд апошняй чвэрці (або "на ветах", што адпавядала завяршальнай фазе Месяца), нашы продкі верылі ў хуткае гаенне ран. Рэкамендавалі нават ускрываць старыя раны, каб яны загаіліся хутчэй. Ветах лічылі ідэальным часам для пазбаўлення ад шкоднікаў на агародзе і паразітаў у дзяцей. Трэці тыдзень (гэта першая чвэрць Месяца, вядомая як "гнілуха") была неспрыяльнай не толькі для сяўбы, але і для іншых спраў. Дарэчы, у народных замовах Месяц і Сонца часта згадваюцца разам. У гэтым падкрэсліваецца іх узаемны ўплыў на жыццё на Зямлі.

## МЕСЯЦ І ЧАС

Месяц — гэта свяціла, якое прыбывае, змяншаецца і знікае. Яго жыццё падпарадкаванае агульнаму закону нараджэння, змены і смерці. Падобна чалавеку, Месяц сустракае на сваім шляху трагедыі, бо яго "паслабленне" (памяншэнне памераў і формы па фазах), як і паслабленне чалавека, канчаецца смерцю. На працягу трох начэй зорнае неба застаецца без месяцовага святла, але за гэтай смерцю настае адраджэнне — маладзік. Гэта вечнае вяртанне да першапачатковых формаў, бясконцае чаргаванне ператварае Месяц у свяціла жыццёвых рытмаў. Нядзіўна, што Месяц кіруе ўсімі касмічнымі сферамі, якія падпарадкоўваюцца закону цыклічнасці: вадой, дажджом, раслiннасцю і ўрадлівасцю. Цыклічнасць Месяца ў архаічным мысленні ўвасабляла сабой вечнае, бясконцае кола жыцця, якое заўсёды абнаўляецца і адраджаецца.

Фазы Месяца, або чвэрці, былі адкрыты чалавекам задоўга да астранамічнага часу. Магічная сіла гэтых фаз была вядомая яшчэ ў ледавіковы перыяд. Тады час

вымяраўся непасрэдна па фазах Месяца. Нават сёння некаторыя качавыя плямёны паляўнічых і земляробаў выкарыстоўваюць выключна месяцовы каляндар.

Таксама вядома, што старажытныя германцы вымяралі час начамі. Гэты архаічны спосаб вымярэння да гэтага часу захаваўся ў еўрапейскіх народаў. Напрыклад, некаторыя рэлігійныя святы, такія як Каляды, Вялікдзень, Тройца і Хрышчэнне, святкуюць уначы.

Час, які кіраваўся і вымяраўся фазамі Месяца, называўся "жывым" часам. І ён заўсёды быў звязаны з рэальнасцю прыроды, прылівамі і выпадзеннем ападкаў, з фізіялогіяй чалавечага арганізма, перш за ўсё менструальнага цыклу. Першабытны чалавек заўважыў гэтую асаблівасць Месяца і ўжо ў неаліце аб'яднаў гэтыя рытмы ў сімволіку вады, дажджу, пладнасці жанчын і жывёл, ўраджаю. З тых часоў Месяцу адпавядае сімволіка спіралі, змяі і маланкі.

## ЖЫВЁЛЫ І МЕСЯЦ
## БЫК

Яшчэ ў палеаліце людзі заўважылі, што на маладзік серп начнога свяціла нагадвае рогі быка. У старажытнаіранскай і старажытнаіндыйскай традыцыях бык ёсць вобразам месяцовага боства. На думку некаторых навукоўцаў, сімвалічная сувязь быка і Месяца абумоўлена тым, што месяцовы год з 10-ю месяцамі супадае па працягласці з перыядам цяжарнасці каровы (10 месяцаў). На тэрыторыі Беларусі культ быка прасочваецца з часоў неаліту. Археолагі знаходзілі статуэткі быкоў, іх зубы і косці. Металічныя падвескі-амулеты з выявай галавы быка, знойдзеныя ў Полацку, датуюцца XII стагоддзем. Вакол бычынай галавы на падвесках старажытныя майстры малявалі сем жаночых сілуэтаў. На ілбе быка знаходзіўся прыкметны знак у форме падвойнага трыкутніка, павернутага вяршыняй долу.

## ЗМЯЯ

Некаторыя жывёлы становяцца сімваламі Месяца, таму што іх формы або спосаб існавання выклікаюць асацыяцыі з лёсам самога Месяца. Напрыклад, змяя, якая з'яўляецца на час і зноў знікае, а апроч таго, мае столькі ж кольцаў, колькі дзён у месяцовым месяцы (па старажытнагрэцкаму паданню). Таксама яна скідае скуру, іншымі словамі, несмяротная і перыядычна адраджаецца. Таму змяя валодае сілай Месяца і дарue людзям урадлівасць, мудрасць (здольнасць да прароцтва) і нават неўміручасць.

У Беларусі культ змяі таксама існуе з часоў неаліту. Святыя пагоркі і камяні, прысвечаныя змеям, сустракаюцца па ўсёй краіне. Выявы змяі былі шырока распаўсюджаны на металічных бранзалетах і зашпільках са стылізаванымі канцамі ў выглядзе змяіных галоў. Сялянскія дзяўчаты насілі на шыі каралі з падобнымі матывамі. Шмат хто ў сваіх дамах трымалі і гадавалі хатніх змей (вужоў). Нават з прыходам хрысціянства выкарыстоўвалі абярэгі "Змеевікі". Гэта металічныя (часам каменныя) медальёны звычайна круглай, авальнай або васьміграннай формы. На адным баку змеевіка адлюстроўваўся Ісус Хрыстос, Багародзіца або хрысціянскі святы, а на адваротным баку — змяя або галава Медузы Гаргоны. Такія абярэгі выкарыстоўвалі для абароны ад хвароб. З'явіўшыся ў XI-XII стагоддзях, яны былі папулярныя аж да XV–XVI стагоддзяў. Не выклікае сумневу, што ўсе гэтыя амулеты абярэгі дайшлі з часоў, калі быў шырока распаўсюджаны культ шанавання Месяца.

## ГРАФІЧНЫЯ ВЫЯВЫ МЕСЯЦА НА АБЯРЭГАХ

Лунніца — металічнае ўпрыгожванне ў выглядзе паўмесяца. Выраблялася з бронзы, срэбра і часам нават золата. Лунніцы вядомыя з канца бронзавага веку і шырока распаўсюджаныя ў Егіпце сярод шматлікіх земляробчых народаў Азіі і Еўропы, уключна са славянамі. Такія ўпрыгожанні былі звязаны з верай у сілу Месяца і культам урадлівасці.

Форму лунніц маглі мець завушніцы, падвескі, металічныя дэталі галаўнога ўбору і т. д. Гэта найбольш тыповае і распаўсюджанае жаночае ўпрыгожванне ў славянскай культуры.

Першыя лунніцы на ўсходнеславянскіх землях былі зафіксаваныя яшчэ ў III-IV стагоддзях да нашай эры. У Старажытнай Русі, уключна з беларускімі землямі, яны існавалі з X стагоддзя і працягвалі карыстацца папулярнасцю да першай паловы XIV стагоддзя.

## СІМВАЛІЗМ ЛУННІЦЫ

У навуковым свеце пытанне адносна значэння дадзенага артэфакта застаецца вельмі спрэчным. Доўгі час лунніцу разглядалі выключна як паганскі кудмень. Вобраз Месяца асацыяваўся з грэцкай багіняй Селенай, а ў славянскім паганстве — з багіняй Месяца Дзянніцай. Лунніцу лічылі абярэгам жаночага здароўя. Уплыў Месяца на жаночае здароўе быў вядомы яшчэ ў старажытнасці, таму кудмень надзяляўся здольнасцю прадухіляць развіццё розных захворванняў і спрыяць беспраблемнай цяжарнасці.

Аднак у 1990-я гады шэраг даследчыкаў паставілі пад сумнеў сцвярджэнне, што лунніца ёсць чыста паганскай з'явай. З'явіліся версіі магчымага запазычання лунніц з хрысціянскай культуры Візантыі. Але нават калі лунніца ёсць паганскі сімвал, яна прыжылася і ў хрысціянскім асяроддзі XI–XIII стагоддзяў як сімвал Багародзіцы. Напрыклад, даследчыца Н. Хамайка сцвярджае, што старажытны тып каталіцкай іканаграфіі Панны Марыі называецца "Месяц" ("Luna"). Ужо сама яго старажытная назва сведчыць, што вобраз Мадонны замясціў вобраз рымскай месяцовай багіні.

Сёння лунніцы працягваюць жыць у нацыянальных строях некаторых народаў Індыі і з'яўляюцца элементам фестываляў сярэднявечнай культуры, у тым ліку ў беларускім Мсціславе.

На некаторых лунніцах быў намаляваны крыж — сімвал Сонца. У цэлым лунніца звязана з культам Месяца, які быў часткай аграрнай культуры. Сэнсавае напаўненне месяцовых абярэгаў звязана з верай ва ўрадлівасць, аграрную магію і жаночую сутнасць. Маці-зямля, як і жанчына, якая носіць месяцовыя абярэгі, валодае магутнай сілай ствараць новае жыццё.

# ЗОРКІ

Матыў "Нябеснай Сям'і", дзе зоркі — гэта дзецi мацi Сонца i бацькi Месяца, назiраецца ў наступным прыкладзе:

"Стаіць цярём вышы ўсіх харом.
А ў тым цераме ды чатыры куты,
Чатыры углы да чатыры акны...
У адным акне – ясён месяц,
У другім акне – ясна заря
(Красна Сонца),
А ў трэцім акне – дробныя звёзды,
А ў трэцім акне – дробныя звёзды.
Ясён месіц – Віцютка-пан,
Ясна заря (Красна Сонца) – яго жана,
Дробныя звёзды – яго дзеткі,
Цёмная ночка – уся яго сям'я".

Зорка — сімвал чалавечай душы. У традыцыйнай беларускай культуры зорка асацыявалася з чалавекам, яго лёсам і характарам. Верылі, што кожнаму чалавеку адпавядае свая зорка: "Колькі на небе зорак, столькі на зямлі людзей, і ў кожнага свая зорка".

Па народных уяўленнях, пры нараджэнні чалавека анёлы запальваюць яго зорку, а пры смерці яна падае з неба, таму што анёлы яе гасяць:

**❝ "Кожны чалавек мае сваю зорку, а Бог на небе творыць штораз новыя, штоб было пораўну і зорак, і людзей".**

Існавала таксама меркаванне, што зоркі — гэта душы памерлых людзей. Яркасць зоркі магла расказаць пра лёс, характар і сацыяльны статус чалавека: "Розніца ў велічыні і святле зорак паказвае на розніцу грамадскага становішча людзей". Калі чалавек добры і мала грашыць, яго зорка свеціць ярка. Калі ж ён грэшны, яго зорка блякне, а часам і зусім не свеціць, і кажуць, што ён "нягоднік з-пад цёмнай зоркі".

# ВЕНЕРА

Венера — планета самая блізкая да зямлі і бліжэйшая ад яе да Сонца. З боку Зямлі яна падобная да зоркі. Венера ніколі не аддаляецца далёка ад Сонца і добра адлюстроўвае сонечнае святло, таму яе лёгка можна знайсці на небе і назіраць за ёй. Максімальнай яркасці Венера дасягае незадоўга да ўзыходу або пасля заходу Сонца. Асаблівасцю гэтай планеты з'яўляецца яе роўны белы колер. А па сваёй яркасці яна пераўзыходзіць нават самыя яркія зоркі. Усё гэта стварыла добрую глебу для назіранняў і шматлікіх уяўленняў у беларускім фальклоры. Планета Венера мае мноства назваў: Зарніца, Зараніца, Заранка, Світальная Зорка, Вечарніца, Вечарнічка, Вечэрнязора, Звярыніца, Воўча Звязда.

Вечарніца — назва планеты Венеры ў яе вячэрняй бачнасці.

Ваўчыная зорка (Звераніца) — так яе называў даследчык літоўскіх і беларускіх старажытнасцяў А. Кіркор. Ён асацыяваў Венеру з багіняй Цёцяй. Узыход Ваўчынай зоркі быў важнай падзеяй для беларусаў. Паводле народных вераванняў, Бог пасылае Вечарніцу агледзець зямлю перад надыходам начной цемры. Лічаць, што менавіта Вечарніца вінаватая ў "пакаранні Месяца" за шлюбную здраду Сонцу ў міфалагічным сюжэце "Нябеснай сям'і". У польскай культуры Венера ў вячэрняй бачнасці называецца Gwiazda Zajęcowa або Zajęca.

Зарніца — Венера ў ранняй бачнасці. У беларускіх замовах да яе звяртаюцца: "зорачка, зарніца, зара-зараніца — божая памачніца". У некаторых выпадках звароты робяць да Світанку (не блытаць з Венерай-Зарніцай) — свячэнню неба перад прыцемкамі. Узыходзячы на досвітку, Зарніца сваім бляскам як бы спаборнічае з самім Сонцам, якое з'яўляецца ўжо за ёй. У народзе лічылі, што Зарніца будзіць людзей і кліча іх да працы. Яна часта згадваецца ў замовах ад розных хвароб і пошасцяў, часам асобна, часам у пары з Вечарніцай.

## ЗАРНІЦА І ВЕЧАРНІЦА: ЛЕГЕНДЫ

У народнай свядомасці Венера ў сваім ранішняй (Зарніца) і вячэрняй (Вечарніца) прараве не атаясамліваюцца. Людзі бачылі ў ёй два розныя нябесныя аб'екты, кожны з якіх мае свае функцыі.

Па запісах вядомага беларускага этнографа А. Сержпутоўскага, Зарніца — вельмі яркая зорка, якая свеціць рана раніцай і сімвалізуе пачатак дня;

Вечарніца — гэта вячэрняя зорка, якую Бог пасылае агледзець зямлю перад надыходам начной цемры. Адсюль вынікае, што па з'яўленні гэтых зорак на небе вызначалі час — калі трэба ўставаць і пачынаць працу, і калі надыходзіць ноч (адпаведна — заканчэнне працы і час адпачынку). Таксама Зарніцу і Вечарніцу называюць "гасподнімі ці божымі памачніцамі". Гэтыя зоркі, паводле паданняў, служаць памочнікамі Бога, а ў літоўскай традыцыі лічаць дочкамі Сонца. Ранішняя зорка гатуе Сонцу сняданак, а вячэрняя зорка сцеле ложак. У беларускай традыцыі Зарніца і Вечарніца былі прадстаўлены як дочкі Бога. Пра гэта сведчаць згадкі ў замовах: "Дзве зарызараніцы, родныя сястрыцы".

Калі паходжанне назваў "Зарніца" і "Вечарніца" больш-менш вядома — так называюць Венеру ў залежнасці ад часу яе з'яўлення на небе — то такія назвы, як "Звярыніца" і "Ваўчыная зорка", могуць здацца зусім незразумелымі. Даследчык літоўскіх і беларускіх старажытнасцяў А. Кіркор звязваў назву "Ваўчыная зорка" са святам Калядаў. Паводле яго трактоўкі, Грамніца (Цёця) — жонка Перуна, якой адпавядае на небе Венера, у калядную ноч нараджае сына — Дажбога (яму на небе адпавядае Сонца), а цёмныя сілы ў выглядзе дзікіх звяроў (ваўкоў і мядзведзяў) спрабавалі забіць маці з сынам. Таму людзі на Каляды назіралі за гэтай зоркай, бо яе з'яўленне азначае багіню, якая здолела ўратавацца. Варта адзначыць, што міф, прыведзены А. Кіркорам, можа быць не зусім аўтэнтычным, і таму варта крытычна ставіцца да гэтых звестак.

Пачатак Каляд звязваюць са з'яўленнем на небе першай зоркі. Калядная зорка, з якой ходзяць калядоўшчыкі, — сімвалічная выява сапраўднай зоркі, магчыма, Венеры, а можа быць і Сонца. Калі ўлічваць тлумачэнне А. Кіркора, то назва "Ваўчыная зорка" ("Звярыніца") утварылася ад звяроў (ваўкоў), якія пераследуюць

багіню. Літоўцы тлумачылі падобныя назвы тым, што з моманту ўзыходу гэтай зоркі дзікія звяры выходзяць на начное паляванне. Магчыма, менавіта з гэтым звязана такая назва Венеры як "Мядзведзіца".

Для беларускіх міфалагічных уяўленняў характэрны сюжэт, у якім Месяц і Сонца, або Месяц і Венера (Вечарніца або Зараніца), утвараюць сямейную пару. Гэты матыў часта сустракаецца ў вясельных песнях. Гісторык і этнограф М. Доўнар-Запольскі вывучаў вобразы Месяца і Сонца ў беларускай вясельнай паэзіі і адзначаў: Беларуская народная паэзія, пераважна вясельная, захавала рэшткі паданняў пра вяселле Месяца з Сонейкам ці з зарой. Гэта боская шлюбная пара, прататып чалавечага шлюбу, з'ўляецца апякункай апошняга; да Месяца і Сонца звяртаюцца песні з надзеяй на іх блаславенне, асвячэнне шлюбу". Цікава адзначыць, што нявесту часам называюць "зоранькай", параўноўваючы з ёй, а песні спяваюць то пра вяселле Месяца з Сонцам, то пра вяселле Месяца з "Зоранькай", ранішняй зарой. Такім чынам, Венера замест Сонца выступала ў ролі нявесты (ці жонкі, сяброўкі) Месяца. Можна правесці пэўныя паралелі з Балтыйскім міфам "Нябеснае вяселле", сюжэт якога мы ўжо прыводзілі. Хутчэй за ўсё, Месяц у міфе даглядае вячэрнюю зорку, бо ў гэты час Сонца знікае з неба. Венера ўяўляецца як суперніца Сонца, бо сваім бляскам яна пераўзыходзіць усе астатнія зоркі на небе.

Як ужо адзначалася, планета Венера часта згадваецца ў замовах, прычым у розных кантэкстах: ад лячэння хвароб да любоўных, гаспадарчых і іншых замоваў. Чаму так часта згадваюць Зараніцу і Вечарніцу? Адказ просты: яны лічацца "божымі памачніцамі", самі маюць нябеснае паходжанне, а таму могуць дапамагчы людзям данесці свае просьбы да Бога. Пра здольнасці Венеры дапамагаць людзям у магіі і вядзьмарстве сведчыць яе назва "Ведзьмерагіна", якая захавалася ў беларуска-літоўскай традыцыі. Назва спалучае ў сабе беларускае слова "ведзьма" і літоўскае "ragana", якое таксама азначае "ведзьма". Венера адлюстроўвае ў міфалагічнай свядомасці жаночае, мацярынскі пачатак. Дзве яе праявы часта выступаюць як дзяўчыны-сёстры.

**❝ У замовах нярэдка згадваюцца зоры-зараніцы побач з Багародзіцай, напрыклад: "Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Мамке пакланюся, я з словам, Бог з помаччу. Зоры-заранічкі, божыя памашнічкі, памагалі Богу, памажыце і нам...".**

Зараніца і Вечарніца таксама спрыяюць дабра-быту і дастатку.

# ЯК РАНЕЙ БЕЛАРУСЫ НАЗЫВАЛІ НЯБЕСНЫЯ СВЯЦІЛЫ

## АРЫЁН

У нас яго называлі Касцы. Увосень і ўвесну, калі зоркі ясна бачныя, нібыта пасля іх узыходу пачыналіся палявыя работы. Апроч таго, ланцужок з трох зорак вельмі падобны да малюнку трох касцоў па тры ў шэраг. У розных рэгіёнах гэта сузор'е яшчэ называлі Каромыслам: тры зоркі ў поясе сузор'я — гэта дзяўчына, якая нясе на плячах каромысел. На Браслаўшчыне пояс Арыёна называлі Тры каралі, гэта значыць тры вешчуны. Таксама існуе легенда, што гэта Тры сястры, да якіх ніхто не мог пасватацца. Усе вырашылі, што яны ведзьмы, якіх не зможа адолець нават змей. Але аднойчы іх дом раптам загарэўся сам па сабе, і тры сястры ператварыліся ў зоркі.

## ВЯЛІКАЯ МЯДЗВЕДЗІЦА

У гэтым сузор'і беларусы бачылі Воз або Калясніцу, а таксама Карэту (чатырохкутнік — воз, а тры зоркі ў шэраг — коні). Па адным са старажытных павер'яў, гэта магла быць калясніца Перуна, бога агню. У часы хрысціянства вобраз Перуна быў часткова заменены Святым Іллём. Калі святы ехаў на сваёй калясніцы па небе, ён маланкамі разганяў перад сабой чарцей, так і паўставала навальніца. Адам Міцкевіч называў сузор'е Возам Давіда. Іншыя назвы – Коўш, Чарпак.

## ЦМОК

Беларускі і польскі фалькларыст, этнограф Міхал Федароўскі зафіксаваў на Палессі павер'е, што быццам бы вакол Палярнай зоркі вісіць змей, якога мы называем Цмокам. Святы Юрый забіў яго, а потым дзідай прыбіў да неба. Адсюль і назва Цмок, а ў нас — Змей.

## КАМЕТА, АБО МЯТЛА

Гэта нябеснае свяціла, час ад часу з'ўляецца на зорным небе і прадвесціць розныя няшчасці: войны, голад, холад, хваробы і т. д. У залежнасці ад таго, у які бок былі апушчаны рогі або хвост каметы, меркавалі, што той бок і будзе "змецены" дашчэнту. Адсюль і народная назва Каметы — Мятла. Верылі, што існуюць каметы, якія наогул не бачныя на небе, а толькі на Сонцы. Калі такая камета зацемніць Сонца, адбываюцца сонечныя зацьменні, але шкоды гэта не прыносіць. Таксама зацьменне Месяца тлумачылі тым, што зморшчыны адзення Каметы-Мятлы, развіваючыся ў паветры, засланяюць ззянне Месяца. Калі здараліся зацьменні, людзі імкнуліся як мага хутчэй зачыніць студні, каб абараніць сваіх жывёл ад хваробы. Знахары на Палессі казалі, што калі прыйдзе такая страшная камета і спачатку пакрые ўсё неба, а потым ляжа на зямлю, то настане канец свету.

## КАПЭЛА

Гэта самая яркая зорка ў сузор'і Возніка. У перакладзе з латыні імя Капэла азначае "козачка", паколькі ў старажытнарымскай міфалогіі гэта зорка сімвалізавала казу Амалфею, якая выкарміла Юпітэра. У Беларусі са з'ўленнем на небе гэтай зоркі на Каляды пачыналі есці куццю. Магчыма, што вобраз казы як

святочнага персанажа калядных дзеяў з'яўляецца зямным увасабленнем нябеснай казы-зоркі. Існуе меркаванне, што гэтая нябесная козачка мае наўпроставае дачыненне да "казы" або "казла" — цэнтральнага і самага распаўсюджанага персанажа на-шых Калядаў. Бо зорка Капэлы на Каляды — самая высокая і вельмі яркая зорка на небе.

## ЛЕБЕДЗЬ

Гэта сузор'е падобна да крыжа, адсюль і народныя назвы, звязаныя з выявай крыжа. Часам яго называлі Пятрова палка, Цароў крыж, Сумленны крыж. Асноўныя легенды маюць хрысціянскія карані. У прыватнасці, казалі, што пасля распяцця Хрыста на крыжы на зямлі засталіся часткі гэтага крыжа, цвікі і адзежа Збавіцеля. І як меркавалі, у сузор'і знаходзіцца частка крыжа — хрысціянскай рэліквіі, на якой быў укрыжаваны Хрыстос. Яго можна разумець і як ключ ад нябеснага храма, які, паводле евангельскага падання, быў дадзены Святому

## МЛЕЧНЫ ШЛЯХ

Часцей за ўсё гэта скопішча зорак называлі Птушыным шляхам або Гусінай дарогай. Бог стварыў гэты шлях для таго, каб птушкі (гусі) ведалі ўвосень, якой дарогай ім адлятаць у вырай, а ўвесну — як вяртацца дадому. Падобныя легенды характэрныя для Беларусі, Літвы і Эстоніі. На Палессі, як і ва Украіне, Млечны Шлях называлі Чумацкім Шляхам: па гэтых зорках чумакі ўзімку накіроўваліся ў Адэсу. Ёсць і такія назвы, як Дарога на Кіеў, Дарога на Іерусалім. Часта кажуць, што па Млечным шляху ходзяць святыя, анёлы, душы памерлых людзей або што гэта душы ў выглядзе птушак лятуць у іншасвет. Лічылі таксама, што Млечны Шлях звязаны з малочнай прадуктыўнасцю кароў: чым ярчэй Млечны Шлях на небе, тым менш у іх надояў, бо малако цячэ менавіта па Млечным шляху. Існуе таксама меркаванне, што з Млечным шляхам звязаны знакаміты вобраз "малочнай ракі з кісельнымі берагамі".

## ПАЛЯРНАЯ ЗОРКА

Асаблівасць гэтай зоркі ёсць у тым, што яна заўсёды стаіць на адным месцы. Гэтае пастаянства адбілася ў назвах. Адна з іх — Зорны кол. Але гэтае імя лічыцца запазычаным з цюркскай мовы. Беларусам вядома назва Паўночная зорка. Даволі часта разам з гэтым імем у традыцыйных запісах фігуруюць і іншыя: Паўночна гвязда, Паўдзённая (Паўднёвая) зорка. У беларускай казцы ёсць вобраз Палярнай зоркі — цвіка, убітага ў неба. Палярная зорка — гэта пачатак Малой Мядзведзіцы, якую суадносна з Вялікай Мядзведзіцай у нас называлі Малым Возам або Малымі Калёсамі.

## ПЛЯЯДЫ

Гэтая купка зорак нагадвае дзіркі ў сіце, таму ў Беларусі зафіксавана назва сузор'я — Сіта, праз якое Бог прасеяў першыя зярняты жыта. Вядомы беларускі фалькларыст Аляксандр Сержпутоўскі, напрыклад, пісаў, што сіта — гэта месца, дзе праведныя душы аддзяляюцца ад грэшных. А ў палякаў і літоўцаў дагэтуль існуе легенда, што гэта і ёсць тое рэшата, якім Багародзіца сеяла, а потым, на свята Успення, павесіла яго сярод зорак. На Палессі гэта сузор'е мела агульнаеўрапейскую назву Курачкі, або Куркі. Па адной з легенд, калі свет толькі ствараўся, Месяц мог апускацца на Зямлю. У гэты час куры пачыналі бегаць па месяцы і дзяўбці зоркі. Каб яны не здзяўблі ўсе зоркі, Месяц і Зямлю разлучылі, і куры ўжо не могуць дацягнуцца да зорак. Сустракаюцца таксама такія назвы, як Стажар'е, што азначае памост пад стог сена або сам стог сена, Валасажар, Кучкі, Купкі, Сем Мальцаў.

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ:


1. Авілін, Цімафей. Паміж небам і зямлёй: этнаастраномія / Цімафей Авілін – Мінск: Тэхналогія, 2015. – 287 с.
2. Вайшкунас, Й. Народная Астраномія беларуска-літоўскага памежжа / і. Вайшкунас / / Балта-славянскія даследаванні. XVI. Масква, 2004. С. 168-179.
3. Валодзіна, Т. Абыдзённік /Т. Валодзіна, Г. Лапацін // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 14-15.
4. Валодзіна, Т. Заход сонца /Т. Валодзіна // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 186—187.
5. Валодзіна, Т. Усход сонца /Т. Валодзіна // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С.486—487.
6. Васілевіч, У. Купала /У. Васілевіч // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С.260—261.
7. Гальковский, Н.М. Барацьба хрысціянства з рэшткамі паганства ў Старажытнай Русі. Т. 1 //Зап. Маскоўскага археалагічнага ін-та. М., 1913. Т. XVIII.
8. Доўнар-Запольскі, М.В. Даследаванні і артыкулы / М.В. Доўнар-Запольскі. - Кіеў, 1909. - Т. 1. - 487 с.
9. Дучыц, Л. Змей / Л. Дучыц, Э. Зайкоўскі, А. Прахараў, І. Швед // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С.190—192.
10. Дучыц, Л. Язычніцтва старажытных беларусаў / Л.Дучыц, І. Клімковіч. – Мінск: Харвест, 2014. – С. 19—26.
11. Маляўнічая Расія: Айчына наша ў яго зямельным, гістарычным, племянным, эканамічным і бытавым значэнні / пад агульнай рэдакцыяй П.П. Сямёнава: Т. 3. Ч. 1: Літоўскае Палессе; Ч. 2: Беларускае Палессе. - Спб., М., 1882. - 490 с.
12. Легенды і паданні /склад. М.Я. Грынблаті А.І.Гурскі. – Мінск: Навука і тэхніка., 1983. – С. 37, 43, 44.
13. Зайкоўскі, Э. Бык /Э. Зайкоўскі // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 57—58.
14. Зайкоўскі, Э. Квадры месяца /Э. Зайкоўскі // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 237.
15. Зайкоўскі, Э. Ярыла/Э. Зайкоўскі // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 544—545.
16. Кабашнікаў, К. П. Беларуская вуснапаэтычная творчасць / К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік, А. С. Ліс. — Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – С. 950.
17. Карпенка, Ю.А. Назвы зорнага неба /Ю.А. Карпенка. – М., 1981.
18. Клімковіч, І. Калі адчыняюцца нябёсы /І. Клімковіч. – Мінск: "Мастацкая літаратура", 2012. – С. 39—45.
19. Клімковіч, І. Насустрач вясне /І. Клімковіч //Маладосць.– 2012 — № 2.
20. Крыж /Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be-tarask.wikipedia.org/wiki/%D0%9A%D1%80%D1%8B%D0%B6 . – Дата доступу: 16.04.2023.
21. Лунніца /Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%9B%D1%83%D0%BD%D0%BD%D1%96%D1%86%D0%B0. Дата доступу: 26.03.2023.

22. Лобач, У. Сусветнае дрэва /У. Лобач // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С.466—467.
23. Прохараў, А. Конь /А. Прохараў // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 245—247.
24. Раманюк, Міхась Беларускія народныя крыжы /Міхась Раманюк. – Вільня: "Наша Ніва", Дзяніс Раманюк, 2000. – 222 с.
25. Салавей, Л. Зара-Зараніца /Л. Салавей // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 184—185.
26. Салавей, Л. Ігра сонца /Л. Салавей // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 201—202.
27. Салавей, Л. Каляды /Л. Салавей // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С.216.
28. Санько, С. Вечарніца //С. Санько // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 79—80.
29. Санько, С. Воз //С. Санько // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. –Мінск: Беларусь, 2011. – С. 85—86.
30. Санько, С. Зарніца //С. Санько // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 185.
31. Санько, С. Зоркі //С. Санько // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 194—195.
32. Санько, С. Каза /С. Санько //Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 210.
33. Санько, С. Камета /С. Санько //Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 220.
34. Санько, С. Касары /С. Санько //Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 231.
35. Санько, С. Месяц /С. Санько // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 301—303.
36. Санько, С. Птушыны шлях /С. Санько //Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 378.
37. Санько, С. Сонца /С. Санько, Я. Сахута // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік /склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – С.455—456.
38. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі. – Мн., 1930. – С. 7, 23, 25.
39. Скварчэўскі, Д.В. Планета Венера ў традыцыйных уяўленнях беларусаў /Д.В. Скварчэўскі //Рэха мінуўшчыны/ Зб. навук. Артыкулаў Студэнцкага навук. тав-ва фак-та гісторыі і сацыялогіі ГрДуімя Я. Купалы. – Гродна: ГрДуімя Я. Купалы, 2011. – С.249—253.
40. Трафімовіч, Антон. Зорнае неба Беларусі. Як у народзе ў даўніну называлі нябесныя свяцілы / Антон Трафімавіч //Аргументы і факты ў Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://aif.by/timefree/zornae_neba_belarus_yak_u_narodze_da_njnu_nazyvalj_nyabesnyya_svyacjly?ysclid=m0844jzycb338181919.- Дата доступу: 23.04.2014.
41. Эліядэ, Мірча. Сонца і салярныя культы /МірчаЭліаде //Трактат па гісторыі рэлігій. Т. 1. – СПб: Алетейя, 1999. – С. 240—291.
42. Эліядэ, Мірча. Луна и мистика луны /МирчаЭлиаде //Трактат по истории религий. Т. 1. – СПб: Алетейя, 1999. – С. 292—345.
43. Federowski, M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej / M. Federowski. T. 1. – Kraków, 1897. – S. 7.
44. Federowski, M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej /M. Federowski/ T. 4. – Warszawa, 1935. – S. 165.
45. Pietkiewicz, Gzesław. Kultura duchowa Rolesia Rzeczyckiego. Materjały etnograficzne / GzesławPietkiewicz. – Warszawa, 1938. – S. 12.